НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ — ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ У БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, ЗА МІР, ДЭМАКРАТЫЮ І САЦЫЯЛІЗМ!

(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 1 МАЯ 1980 г.).

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
30
КРАСАВІКА
СЕРАДА
№ 16 [1280]
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

З ПЕРШАМАЕМ!

ВЯСНОВЫ ВЕТРЫК палошча над зямлёй кумачовыя сцягі Першамая. Людзі працы ўсіх краін і кантынентаў адзначаюць вялікае свята—Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных у барацьбе супраць імперыялізму, за мір, дэмакратыю і сацыялізм. Савецкі народ, народы братніх сацыялістычных краін, увесь працоўны люд планеты з новай сілай дэманструюць, што рэвалюцыйнае абнаўленне свету, пачатае Вялікім Кастрычнікам, развіваецца і мацнее, што справа міру, прагрэсу і сацыялізму неадольна ідзе наперад і перамагае.

Першамай. У ім так арганічна спалучаюцца веснавое абуджэнне зямлі, пяшчотная зеляніна лясоў і палёў з чырванню сцягоў, з шэсцем святочных калон. Прырода неяк па-асабліваму адцяняе ўзнёсласць і прыгажосць нашага свята, яго непарыўную сувязь з прыгажосцю стваральнай людской працы. У вірлівых дэманстрацыях быццам зліваецца напружаны гул пасяўной, адвечнай і самай мірнай бітвы за хлеб, і сполахі касмічных стартаў, размераны рытм заводаў і фабрык, электрычных станцый і звонкасць рэек Байкала-Амурскай магістралі, гарачы подых цаліны.

Першамай — гэта яркая дэманстрацыя дасягненняў нашага народа-тварца, які натхнёна ажыццяўляе гістарычныя прадвызначэнні XXV з'езда КПСС, заданні юбілейнай дзесятай пяцігодкі. Практыка наглядна, пераканаўча сведчыць, што курс, выпрацаваны партыйным з'ездам, наступнымі Пленумамі ЦК КПСС, — правільны навукова абгрунтаваны ленінскі курс, які адпавядае карэнным інтарэсам савецкіх людзей, патрабаванням сучаснага грамадскага развіцця, а палітыка нашай партыі — кроўная справа ўсяго савецкага народа.

У святочных калонах першамайскай дэманстрацыі будуць ісці выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты БДУ імя У. І. Леніна—лепшыя прадстаўнікі шматтысячнага універсітэцкага калектыву. Яны выйдуць на гэту дэманстрацыю з ясным усведамленнем зробленага і з велічнымі перспектывамі далейшага развіцця. За мінулы год універсітэт выйшаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва і ўзнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых установ. Універсітэцкі калектыў, натхнёны высокай ацэнкай яго працы, і далей з гонарам будзе апраўдваць званне флагмана вышэйшай школы Беларусі, займаць дастойнае месца ў сузор'і ВНУ і навуковых цэнтраў нашай Радзімы, уносіць важкі ўклад у справу камуністычнага будаўніцтва.

Гэта да нас звернуты словы з Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1980 года: «Работнікі ВНУ і тэхнікумаў! Паляпшайце ідэйную загартоўку і прафесіянальную падрыхтоўку спецыялістаў, развівайце навуку, памнажайце ўклад у камуністычнае будаўніцтва!». Прыкладзём жа, таварышы, максімум энергіі і старання, каб дастойна, канкрэтнай справай адказаць на крылатыя словы партыі, такія блізкія і сугучныя нашым думкам і настрою.

Са святам, таварышы!

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ.

НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

НА ФІЗІЧНЫМ факультэце прайшла XXXVII студэнцкая навуковая канферэнцыя. На ёй працавалі секцыі ядзернай фізікі, фізікі паўправаднікоў і мікраэлектронікі, тэарэтычнай фізікі ,біяфізікі, фізікі цвёрдага цела, оптыкі і аптычных квантавых генератараў, цеплафізікі. Акрамя спецыяльных секцый, на канферэнцыі працавалі секцыі марксісцка-ленінскай філасофіі, палітэканоміі, англійскай, нямецкай і французскай моў, а таксама секцыя падагогікі. Усяго з дакладамі выступіла звыш 340 чалавек. Каля 70 дакладаў адзначана падзякамі і дыпломамі. Лепшыя з іх будуць прадстаўлены на чарговы Рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел госці з Масквы (МФТІ і МІФІ), Адэсы і Тбілісі. Яны прадставілі 15 цікавых і змястоўных дакладаў па праблемах эксперыментальнай і тэарэтычнай фізікі. Два даклады студэнтаў з Тбілісі прапанаваны пасля пэўнай дапрацоўкі да апублікавання.

А. ЦІМОШЧАНКА,
член камітэта камсамола фізфака, аспірант.

РАЗНАСТАЙНАЯ ТЭМАТЫКА

ДВА ДНІ працавала на журфаку навуковая канферэнцыя, якая стала сапраўдным святам навукі.

Навуковая канферэнцыя стала ўжо традыцыяй на факультэце. Таму ў гэтыя дні прыехалі сябры па пяру з Кіеўскага і Львоўскага універсітэтаў, якія таксама прынялі удзел у рабоце канферэнцыі. Госці сардэчна павіншавалі ўсіх прысутных з пачаткам работы навуковага форума факультэта. Прагучала радыёперадача, якую спецыяльна да канферэнцыі падрыхтавалі студэнты чацвёртага курса.

Святочнае пасяджэнне адкрыла доктар філалагічных навук Е.Л. Бондарава. На суд студэнтаў былі вынесены даклады ленінскай тэматыкі: «Вобраз Леніна ў кіно», «Ленін і радыё», «Літаратурныя героі ў творах Леніна».

Працавалі секцыі тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, гісторыі журналістыкі, радыё і тэлебачання.

На заключным пасяджэнні актыўныя ўдзельнікі студэнцкіх навуковых гурткоў былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі і дыпломамі. У іх ліку Галіна Сачанка, Таццяна Чыгрынава, Наталля Расоха, Андрэй Мазанік, Валянціна Шаліўская.

Л. БЕРДНІК.
(Прэс-цэнтр прафкома).

● ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

БАЧЫЦЬ ПЕРСПЕКТЫВУ

ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ гістарычнага факультэта—адна з самых шматлікіх ва універсітэце. Партыйнае бюро значную ўвагу ўдзяляе рабоце з маладымі камуністамі. Менавіта тут, у радах партыйнай арганізацыі факультэта і універсітэта, на наш погляд, малады камуніст павінен прайсці сур'ёзную партыйную загартоўку.

На факультэце дзейнічаюць тры школы маладога камуніста. Заняткі праходзяць па праграме, зацверджанай партыйным бюро факультэта. Кіраўнікамі школ з'яўляюцца вопытныя спецыялісты-педагогі з вялікім партыйным стажам. Формы выкладання самыя разнастайныя. Побач з лекцыямі практыкуюцца семінары, даклады слухачоў школы. Для выступленняў на занятках запрашаюцца ветэраны вайны, працы. Важным сродкам прывіцця навыкаў і ўмення непасрэднай арганізатарскай працы з'яўляецца прыцягненне маладых камуністаў да падрыхтоўкі і правядзення партыйных сходаў. За партгрупамі замацоўваюцца спецыяльныя ўчасткі работы, якія пасля іх выканання замяняюцца новымі.

У партарганізацыі ўсе маладыя камуністы маюць пастаянныя і аднаразовыя даручэнні. На першым месцы сярод даручэнняў з'яўляецца работа ў камсамоле. З 71 маладога камуніста—студэнта на кіраўнічай камсамольскай рабоце заняты 43 чалавекі. Акрамя таго, у студэнцкім прафсаюзе і студсавеце інтэрната працуюць яшчэ 18 маладых камуністаў. Большасць старост акадэмічных груп — члены КПСС. Многія з камуністаў узначальваюць акадэмічныя сектары камсамольскіх бюро груп, курсаў і аддзяленняў.

Даручыць маладому члену КПСС які-небудзь участак работы — гэта яшчэ не гарантыя поспеху. Улік грамадскіх даручэнняў і кантроль за іх выкананнем — вось тыя рычагі, з дапамогай якіх дасягаецца максімальны вынік. За каардынацыю работы з маладымі камуністамі ад партбюро адказвае В. А. Андруховіч — чалавек, добра знаёмы са спецыфікай грамадскай работы. Ён накіроўвае і кантралюе выкананне грамадскіх даручэнняў маладымі камуністамі. Партыйнае бюро перыядычна заслухоўвае маладых камуністаў аб выкананні імі партыйных і грамадскіх даручэнняў.

Мы лічым, што сур'ёзнае грамадскае даручэнне з'яўляецца тым важнейшым сродкам, з дапамогай якога патрэбна весці работу па падрыхтоўцы рэзерву для паступлення ў члены КПСС. Такі рэзерв абмяркоўваецца персанальна ў партгрупах і на пасяджэннях партбюро. У яго ўключаюцца актывісты, якія ўжо праявілі сябе ў грамадскай рабоце. Уключэнне ў рэзерв азначае сур'ёзнае даручэнне, якое знаходзіцца пад кантролем адной з партгруп і непасрэдна партбюро. Так было са студэнтам V курса аддзялення гісторыі, імянным стыпендыятам Ігарам Велічанскім, які выдатна справіўся з даручэннем партбюро і быў прыняты кандыдатам у члены КПСС.

Важным сродкам стымулявання якаснага выканання грамадскага даручэння, на наш погляд, з'яўляюцца індывідуальныя размовы членаў партбюро, партгрупоргаў з камуністамі. У час гэтых размоў выяўляюцца многія рысы асобы.

Гатоўнасць своечасова прыйсці на дапамогу, параіць, вылучыць асноўныя звенні ў жыцці партгрупы — вось асноўныя крытэрыі ў рабоце партбюро факультэта з маладымі камуністамі.

М. ЕЛІСЕЕЎ,
сакратар партбюро гістфака.

● 5 МАЯ — ДЗЕНЬ ДРУКУ

ТРЫБУНА ГРАМАДСКАСЦІ

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ прайшоў агляд-конкурс насценных газет факультэтаў, прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. З якімі паказчыкамі ў вучобе, навукова-даследчай рабоце прыйшлі факультэты да гэтага свята, і расказвае насценны друк.

Прыемна адзначыць, што першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод прыродазнаўчых факультэтаў заняў фізічны факультэт, сярод гуманітарных першымі сталі журналісты. Гэта значыць, што пераможцам спаборніцтва ёсць што расказаць.

Самая змястоўная і шматжанравая газета—«Журналіст». Мне могуць запярэчыць — «Гэта ж іх хлеб!». Але патрэбна не забываць, што кожны нумар «Журналіста» робіцца з вялікай адказнасцю, з душою. Будучыя журналісты ведаюць, што прафесійны рост пачынаецца менавіта тут, у сценах роднага факультэта. Бо твае матэрыялы прачытаюць сябры, выкладчыкі, зробяць заўвагу, паспрачаюцца, параяць.

Тэматыка газетных выступленняў самая рознабаковая. Найбольшая ўвага аддаецца ленінскай тэме: «Старонкі ленінскай навуковай канферэнцыі», «Навукова-тэарэтычная канферэнцыя выкладчыкаў па актуальных пытаннях публіцыстыкі ў святле ленінскага вызначэння», «Ленін у маім жыцці». У газеце гэтая рубрыка стала традыцыйнай. Надзённыя і змястоўныя матэрыялы прысвечаны камуністычнаму суботніку, сакавіцкаму агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці і інш.

Ёсць што пераняць у газетах фізікаў і біёлагаў. Іх газеты кампактныя і акуратна аформлены. Матэрыялы надрукаваны на рознакаляровай паперы, здымкі размешчаны з густам, што робіць газеты маляўнічымі і прыцягальнымі. Шырокі аўтарскі актыў газет. Гэта дазваляе змяшчаць самыя разнастайныя матэрыялы.

У рэдкалегіі гэтых газет хапае і фантазіі, і густу, і дасціпнасці. Выкарыстаны кожны сантыметр газетнай плошчы. Адчуваюцца ўдумлівыя адносіны да кожнага надрукаванага матэрыялу.

Не адстаюць і гісторыкі. Шырока асвятляецца газетай камсамольскае жыццё. Адразу ж заўважаеш падборку фотаздымкаў, якія расказваюць аб буднях факультэта. Прыцягвае ўвагу матэрыял «Старонкі гісторыі», які дапаўняецца фотаздымкамі і выдзяляецца на фоне астатніх. Гумар гісторыкаў таксама не пакіне абыякавым.

У юрыстаў значную плошчу газеты займае асвятленне работы групы «Пошук». Хваляванне выклікае пісьмо былога выкладчыка Мінскага юрыдычнага інстытута дацэнта П. Я. Рубінчыка, якое змешчана ў газеце. Звесткі пра Паўла Яфімавіча (зараз падпалкоўнік запасу) былі знойдзены групай «Пошук» у гэтым годзе.

У «Алгарытме» вызначаецца змястоўнасцю дыскусія: «Ці патрэбен групе куратар?», якая вядзецца на старонках газеты.

Галоўнае, што паказаў агляд-конкурс: насценны друк універсітэта знаходзіцца на правільным шляху.

Л. БУСЬКО.

НА ЗДЫМКУ:
Голухава Галіна і Юргель Лілія, супрацоўнікі навукова-даследчай лабараторыі возеразнаўства, праводзяць дослед па вызначэнню кіслотнасці вады.

Фота М. ДУБОВІКА.

СУСТРЭЛІ ДАСТОЙНА

ВЯЛІКІМІ ПРАЦОЎНЫМІ поспехамі сустрэў 110-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна калектыў вылічальнага цэнтра Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Да юбілейнай даты прыўрочаны выпуск зборніка прац супрацоўнікаў ВЦ. Распрацаваны, укаранёны і паспяхова эксплуатуюцца падсістэмы АСК ВНУ «Прыём у ВНУ» і «Кантроль за выкананнем дакументаў». Распрацавана і рэалізавана на ЕС ЭВМ аўтаматызаваная сістэма аналізу электронных схем. Упершыню ў краіне распрацаваны пакет прыкладных праграм па апрацоўцы біямедыцынскай інфармацыі. Ён прыняты і рэкамендаваны да вопытнай эксплуатацыі. Распрацоўваюцца і ўкараняюцца на прадпрыемствах рэспублікі алгарытмічныя і праграмныя сродкі мадэліравання праектуемых электронных прылад. Супрацоўнікі вылічальнага цэнтра актыўна распрацоўваюць метады і сродкі аўтаматызацыі падрыхтоўкі спажыўцоў сучасных машын, праграмнае забеспячэнне функцыяніравання аўтаматызаванай сістэмы апрацоўкі інфармацыі Савета Міністраў БССР, даследуюць і ўкараняюць метады, алгарытмы і аўтаматызаваныя сістэмы пабудовы тэкстаў і сінтэза дыскрэтных прылад вылічальнай тэхнікі.

Нядаўна адбылася тэарэтычная канферэнцыя супрацоўнікаў вылічальнага цэнтра па тэме: «У. І. Ленін аб сацыялістычным спаборніцтве і камуністычных адносінах да працы». У яе рабоце прыняло удзел больш 200 супрацоўнікаў. На канферэнцыі выступілі загадчыкі аддзелаў, вядучыя супрацоўнікі, партыйныя, прафсаюзныя і камсальскія актывісты, дацэнт кафедры палітэканоміі В. В. Мархонька. У дакладах «У. І. Ленін аб сутнасці сацыялістычнага спаборніцтва», «Ленінскія прынцыпы арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва», «Спалучэнне матэрыяльных і маральных стымулаў у працэсе арганізацыі і правядзення сацыялістычнага спаборніцтва», «Роля сацыялістычнага спаборніцтва ў працэсе ўкаранення вынікаў НДР у вытворчасць», «Задачы спаборніцтва» і інш. удзельнікі канферэнцыі праналізавалі вопыт работы калектыву вылічальнага цэнтра скрозь прызму ленінскай тэарытычнай спадчыны, выказалі рад практычных прапаноў, якія будуць садзейнічаць паляпшэнню арганізацыі работы ВЦ, умацаванню працоўнай дысцыпліны, павышэнню грамадска-палітычнай актыўнасці супрацоўнікаў.

У камсамольскай арганізацыі адбыўся сход на тэму: «З імем Леніна, пад кіраўніцтвам партыі — на подзвіг і на працу!». Была адзначана вялікая дапамога партыйнай арганізацыі камсамольцам у іх паўсядзённай дзейнасці. Звернута ўвага на неабходнасць умацавання працоўнай дысцыпліны, развіцця актыўнасці маладых спецыялістаў.

Асаблівую ўрачыстасць сходу прыдаў удзел у ім ветэрана партыі, члена КПСС з 1919 года, доктара тэхнічных навук, акадэміка М. В. Ведзенева. У сваім выступленні, якое было выслухана з вялікай ўвагай і цікавасцю, Мікалай Васільевіч расказаў аб дзейнасці і рабоце ленінскай партыі ў перыяд станаўлення Савецкай улады.

Выпушчаны чарговы нумар сценгазеты «Камп'ютэр». Побач з публікацыямі, непасрэдна прысвечанымі юбілейнай даце, у традыцыйнай рубрыцы «Чым жывеш аддзел?» шырока і рознабакова прадстаўлены аддзел дыягностыкі вылічальных сістэм.

А. ГРЫШАНОВІЧ,
член партбюро ВЦ,

А. КАГАНАЎ,
рэдактар сценгазеты.

ВІНШУЕМ З ПЕРАМОГАЙ!

НЯДАЎНА на актыве універсітэта падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва факультэтаў і кафедр за 1979 год.

1. Першае месца, пераходны Чырвоны Сцяг, Ганаровая грамата рэктарата, парткома, мясцкома БДУ і грашовая прэмія ў размеры 250 рублёў па групе прыродазнаўчых факультэтаў прысуджана калектыву фізічнага факультэта (дэкан Э. М. Шпілеўскі, сакратар партбюро І. М. Гуліс, старшыня прафбюро М. Н. Полазаў).

2. Першае месца, пераходны Чырвоны Сцяг, Ганаровая грамата рэктарата, парткома, мясцкома БДУ і грашовая прэмія ў размеры 150 рублёў па групе гуманітарных факультэтаў прысуджана калектыву факультэта журналістыкі (дэкан Р. В. Булацкі, сакратар партбюро А. А. Плаўнік, старшыня прафбюро Н. Ц. Фральцова).

3. Другое месца, вымпел «Пераможцу ў сацыялістычным спаборніцтве», Ганаровая грамата рэктарата, парткома, мясцкома БДУ і грашовая прэмія ў размеры 100 рублёў прысуджана калектыву біялагічнага факультэта (дэкан А. Ц. Пікулёў, сакратар партбюро А. І. Сцефановіч, старшыня прафбюро Т. І. Запольская).

4. Сярод агульнаўніверсітэцкіх кафедр грамадскіх навук першае месца, вымпел «Пераможцу ў сацыялістычным спаборніцтве», Ганаровая грамата рэктарата, парткома, мясцкома БДУ і грашовая прэмія ў размеры 50 рублёў прысуджана кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў (загадчык кафедры Г. П. Давідзюк, партгрупорг А. Н. Пашкевіч, прафгрупорг Е. А. Дудко).

5. Сярод агульнаўніверсітэцкіх кафедр замежных моў першае месца, вымпел «Пераможцу у сацыялістычным спаборніцтве», Ганаровая грамата рэктарата, парткома, мясцкома БДУ і грашовая прэмія ў размеры 50 рублёў прысуджана кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў (загадчык кафедры С. В. Лузгіна, прафгрупорг В. А. Белазёрава).

КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

ДЗЕ ПОШУК, ТАМ ПОСПЕХ

НЕХТА СКАЗАЎ, што справа ўпрыгожвае чалавека, толькі калі гэта не судовая справа. Не карыстаючыся нават вядомымі словамі Чэхава, можна нагадаць не адзін прыклад чалавечай годнасці, прыгажосці не знешняй, а ўнутранай, сапраўднай. Бо гэта такая «дробязь», якая заўжды будзе крытэрыем правільнасці нашых учынкаў і якая ніколі не будзе пераацэнена чалавекам, калі гэта сумленны чалавек, у яго жыццёвай праграме. На жаль, бывае і такі «індывід», які, здаецца, і ведае нашы прынцыпы, і словы кажа гучныя, правільныя, гаворыць аб сумленных адносінах да свайго грамадскага абавязку, толькі на справе аказваецца благім «тэарэтыкам», не заўжды на практыцы ўжывае тыя нормы, не ўжываць якіх нельга. Разрыў паміж словам і справай — гэта зло ў квадраце.

Можа цяпер і не варта варушыць мінулае, успамінаць сёе-тое добрае і не вельмі, светлае і негатыўнае, актыўнае і пасіўнае, што зблізіла нас, студэнтаў-першакурснікаў, што зрабіла нас сябрамі, дапамагло лепей працаваць і вучыцца і што нам перашкаджала. Але, не разабраўшыся ў гэтым дасканала, не адзначыўшы плюсы і мінусы ў нашай ужо амаль гадавой сумеснай рабоце, не ўбачыўшы тых ямін і калдобін, і тых маленькіх перамог, немагчыма зразумець, які ўплыў зрабіў гэты год на наш калектыў і на кожнага асобна, як з розных характараў склаўся калектыў.

...Мы ехалі на бульбу. Першы раз. Мерна стукалі колы цягніка, беглі вагоны, пакідаючы ўсё далей і далей універсітэцкія сцены, сустрэцца з якімі належала праз месяц. Усё было тады новым: і дзяўчына, якая недзе ў суседнім купэ чытала Ясеніна, і ўзрушаная мітусня ў цесных тамбурах, і будучыя сябры. І гэта было вельмі правільна, што знаёмства наша пачалося іменна з выяўлення таго, як хто можа працаваць. Віця Сівіцкі пажартаваў:

— Адны жадаюць працаваць, але не могуць, другія могуць, але не жадаюць...

Як бы там ні было, а касцяк групы, аснова будучага калектыву пачала складвацца ў першыя ж дні нашай студэнцкай сельскагаспадарчай восені. Працавалі мы ў Клімавіцкім раёне, у саўгасе «Мілаславіцкі». Зрабілі шмат, за што і атрымалі падзяку ад дырэкцыі саўгаса. Калі аднойчы па цэнтральнаму тэлебачанню ў праграме «Час» адзначалася праца мілаславіцкіх хлебаробаў, трактарыстаў, аграномаў, якія ў ліку першых у рэспубліцы закончылі ўборку клубняў, нам таксама было вельмі прыемна. Бо ў гэтай перамозе была часцінка і нашай працы.

З першых дзён па ініцыятыве Сяргея Васільевіча Латышава, нашага кіраўніка, былі створаны тры брыгады, якія наладзілі паміж сабой дзейснае сацыялістычнае спаборніцтва за лепшыя вынікі працы на камбайнах. Рэкорд трэцяй брыгады — 55 бункераў на камбайн—неаднаразова быў пабіты іншымі брыгадамі. Была таксама падтрымана членамі ўсёй групы ініцыятыва збіраць бульбу, якая засталася пасля камбайна. Ударна працавалі рабяты і на прыгатаванні вітаміннай мукі, на сартаванні бульбы, буртоўцы... Прыклад якаснай работы штодзённа паказвалі Анатоль Ільюкевіч, Міхаіл Самусенка, Алег Грыгор'еў, Люся Міхайлава, Ала Саўчук, Ірына Янкоўская. Сапраўдны цуд на кухні тварылі нашы кулінары Вольга Каралёва і Алёна Радзецкая.

І за ўвесь час мы не зналі, што такое спрэчкі і канфлікты. Так пачалася дружба. Пачалася з працы. З усмешкі. Амаль кожны вечар гучалі песні. А мастацкае кіраўніцтва ў гэтым напрамку трымаў Сяргей Шухно.

Ужо тады сталі складвацца добрыя традыцыі ў калектыве, якія працягваюцца і да гэтага часу. У якасці прыкладу можна сказаць, што ўсе члены групы шчыра віншуюць імяніннікаў, і дзень нараджэння кожнага — свята агульнае.

Выпрабаванне ў працэсе вучобы паказала здольнасці кожнага, дапоўніла новыя штрыхі да псіхалагічнага партрэта. Вынікі першай сесіі і абнадзейваюць і засмучаюць: 22 чалавекі здалі экзамены на добра і выдатна. У працэнтных адносінах гэта самы высокі вынік на курсе. Ірына Андрэева, Ігар Вераб'ёў, Віктар Юзафовіч здалі першую сесію толькі на выдатна. Але на Ленінскім заліку і на камсамольскім сходзе выявілі, што вынікі, улічваючы магчымасці студэнтаў групы, маглі быць лепшымі.

У нашай групе тры камуністы, трыццаць камсамольцаў. І недахопу ў ініцыятыве не бывае ніколі. Рашылі ўзяць шэфства над цяжкавыхоўваемымі — узялі. Рашылі стварыць у групе тэатр мініяцюр — стварылі. Калі брацца за што-небудзь, дык брацца сур'ёзна — гэтага правіла імкнуцца прытрымлівацца ўсе студэнты. А там, дзе пошук, там і поспех.

Кожны дзень студэнцкага жыцця насычаны рознымі падзеямі. І каб рашэнне было правільным, мы імкнёмся ўсё рабіць разам. Так не толькі лягчэй, але і намнога цікавей жыць. А калі студэнцкія гады праходзяць цікава, яны надоўга застаюцца ў памяці.

У. ПОБАЛЬ,
студэнт першага курса юрыдычнага факультэта.



З ДОБРЫМІ вынікамі ў навукова-даследчай рабоце сустракаюць свята Першамая супрацоўнікі інстытута фізіка-хімічных праблем і хімічнага факультэта нашага універсітэта.

На здымках:

1. Студэнткі II курса хімфака Таццяна Камоцкая, Аксана Шунейка і малодшы навуковы супрацоўнік А. А. Кузьмічоў праводзяць лабараторны практыкум.

2. Аспіранты кафедры неарганічнай хіміі А. І. Кулак і Е. І. Стральцоў у час падрыхтоўкі доследу.

Фота Д. Прэса.



ПАМЯЦІ ЛЕНІНА

Памяці Леніна была прысвечана паездка па маршруту Мінск-Мір-Нясвіж. У ей удзельнічалі студэнты філалагічнага факультэта, факультэта журналістыкі нашага універсітэта, педагагічнага інстытута імя М. Горкага, супрацоўнікі АН БССР. Пачалася яна з расказа студэнта філфака Язэпа Янушкевіча аб рэдактарскай дзейнасці Леніна, выпуску ленінскай «Іскры», аб распаўсюджванні твораў Уладзіміра Ільіча на Беларусі. Былі зачытаны ўрыўкі з прац Леніна: «Задачы саюзаў моладзі», «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура», «Пісьмо ў ЦК», «Аб пралетарскай культуры» і іншыя. Ігар Чарняўскі пазнаёміў студэнтаў з архітэктурнымі помнікамі Міра і Нясвіжа.

В. КОЗЕЛ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

● АХОВА ПРЫРОДЫ

НОВАЕ ПАПАЎНЕННЕ

АДБЫЎСЯ ЧАРГОВЫ, трэці, выпуск слухачоў спецфакультэта па перападрыхтоўцы кадраў па спецыяльнасці экалогія і павышэнне эфектыўнасці выкарыстання прыродных рэсурсаў. Спецфакультэт быў адкрыты у 1977 годзе пры кафедры агульнай экалогіі біялагічнага факультэта ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР аб перападрыхтоўцы кадраў па новых перспектыўных напрамках навукі і тэхнікі. Ён з'яўляецца адным з шасці аналагічных факультэтаў у краіне, якія рыхтуюць экалагічныя кадры на базе спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. У гэтым годзе заняткі спецфакультэта вяліся па новаму вучэбнаму плану. Слухачамі спецфакультэта былі інжынеры прамысловых прадпрыемстваў, спецыялісты арганізацыі кіравання і планавання вытворчасці, работнікі раённых і абласных інспекцый па ахове прыроды, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, настаўнікі сярэдніх школ — усяго 27 чалавек. На працягу 6 месяцаў яны вывучалі асновы экалогіі, праблемы рацыянальнага выкарыстання і аховы водных, зямельных, раслінных рэсурсаў і жывёльнага свету, атмасфернага паветра, меліярацыі ландшафтаў, прыроднаахоўнае заканадаўства, філасофскія аспекты ўзаемадзеяння прыроды і грамадства. Выкладанне на спецфакультэце вядуць вопытныя спецыялісты біялагічнага, геаграфічнага, юрыдычнага факультэтаў. Прыцягваюцца да выкладання вядучыя спецыялісты іншых ВНУ горада Мінска, вучоныя АН БССР. Тэарэтычная вучоба дапаўнялася лабараторнымі, практычнымі і семінарскімі заняткамі, вучэбнымі экскурсіямі на заводскія і гарадскія сістэмы ачысткі сцёкавых вод, у зверагадоўчыя гаспадаркі і запаведнікі.

Слухачы спецфакультэта ўдзельнічалі ў рабоце V з'езда Беларускага таварыства аховы прыроды, Міжнароднага сімпозіума па ахове гарадскога асяроддзя, наведвалі выстаўкі па ахове прыроды.

Выпускныя работы слухачоў спецфакультэта гэтага года былі прысвечаны канкрэтным пытанням аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, утылізацыі адходаў вытворчасці, рэкультывацыі зямель. У іх абагульнены і прааналізаваны з пазіцый сучаснай экалогіі матэрыялы, якія характарызуюць прыродаахоўную дзейнасць прадпрыемстваў, адміністратыўных і грамадскіх арганізацый.

Асабліва адзначаны дзяржаўнай камісіяй і рэкамендаваны да ўкаранення выпускныя работы Р. А. Бараноўскага «Утылізацыя адходаў калійных вытворчасцей», І. Л. Грыненкі «Тэхналогія ачысткі сцёкавых вод і утылізацыя адходаў прадпрыемстваў мясной і малочнай прамысловасці», Л. Д. Коркінай «Ахова падземных вод на тэрыторыі Беларусі ад спусташэння і забруджвання».

Слухачка Г. Ф. Улашчык абрала тэмай сваёй выпускной работы пастаноўку прыродаахоўнай работы ў Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства аховы прыроды, К. К. Пратнік распрацаваў тэму «Асноўныя напрамкі развіцця масавага адпачынку гарадоў Мінска і Магілёва». Выпускная работа С. У. Заўялава прысвечана актуальнай праблеме аховы паветранага басейна горада Мінска, а ўсяго па праблемах, звязаных з аховай навакольнага асяроддзя ў Беларускай сталіцы, абаронена 5 выпускных работ. Усе яны вызначаюцца глыбокай распрацоўкай тэмы, змяшчаюць канкрэтныя рэкамендацыі, якія знойдуць практычнае прымяненне.

Выкладчыкі ВНУ Е. П. Кісялеўская, Р. Я. Пармон, Э. Д. Кузняцова, Н. Ф. Дзям'яненка абаранілі распрацаваныя імі за час навучання цыклы лекцый па курсу «Ахова прыроды» для студэнтаў розных спецыяльных ВНУ Мінска і іншых гарадоў Беларусі.

Выпускная камісія высока ацаніла і рэкамендавала да апублікавання і шырокага ўкаранення распрацоўкі выпускной работы А. Т. Філіпава «Арганізацыя прыродаахоўнай работы ў сельскай школе», у якой дадзены глыбокі аналіз сучаснага стану прыродаахоўнага навучання ў агульнаадукацыйных сярэдніх школах, зместу вучэбных планаў, праграм і падручнікаў. Уласны багаты вопыт арганізацыі прыродаахоўнай работы ў сельскай школе дазволіў аўтару рэкамендаваць новыя формы.

З дыпломамі аб атрыманні вышэйшай экалагічнай адукацыі папаўненне спецыялістаў накіравана на работу ў адпаведныя арганізацыі, дзе яны змогуць прымяніць на практыцы атрыманыя веды.

У. ЛЯХНОВІЧ,
дэкан спецфакультэта, дацэнт.

ФОТА-ІМГНЕННЕ



ВЯСНА... Цяжка ўседзець на занятках, калі за акном шэпча цудоўнае ласкавае сонейка, калі нават дождж не дождж, а цёплыя вясновыя праменні. Хочацца сабрацца разам, па-



слухаць гітару ці проста паскакаць пад жарты сваіх сяброў. Хочацца пець, хочацца танцаваць. Хочацца закахац-

ца. Закахацца ва ўсё. Нават у падручнікі. Толькі гэта вельмі цяжка, бо хутка экзамены. Хутка сур'ёзнае выпрабаванне. Для каго першае, а для каго і апошняе.

Фота **А. Стадуба.**

Лепшым з лепшых калектывам прадпрыемстваў, калгасаў, навучальных устаноў прысвойваецца імя Леніна. Сярод іх і Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Сёння БДУ — буйнейшы вучэбны, навуковы і спартыўны цэнтр краіны. Надзейным сябрам і саюзнікам студэнтаў у працы і вучобе доўгія гады з'яўляюцца фізкультура і спорт. Вучэбны працэс на кафедры фізвыхавання і спорту вядуць 56 выкладчыкаў. Больш шасці тысяч студэнтаў, сярод якіх сорак тры майстры спорту СССР, 264 кандыдаты ў майстры спорту і першаразраднікі, удзельнічаюць у чарговай XXVIII спартакіядзе універсітэта, прысвечанай 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Аб развіцці фізкультуры і спорту ў БДУ за 60 год і пойдзе размова...

Позірк скрозь дзесяцігоддзі

60 ГОД НАЗАД, калі ў БДУ фізкультура і спорт толькі нараджаліся, тут працавалі ўсяго тры выкладчыкі фізвыхавання. Сярод іх былі М. Дарафеева, Я. Камароўскі і Г. Палянскі, які потым перад вайной стаў дырэктарам стадыёна «Дынама». Існавалі курсы фізкультуры пры спецкафедры. Энтузіясты займаліся ў асноўным на адкрытых пляцоўках. А затым грымнула вайна.

...Заканчваўся 1944 год. Яшчэ на захадзе ішлі баі, а ў разбураным Мінску зноў пачаў працаваць універсітэт. Адразу пасля шпіталя прыбыў сюды выкладчык фізвыхавання М. А. Шэйнеман, які стаў у хуткім часе першым загадчыкам кафедры фізвыхавання. Дарэчы, гэта была першая такая кафедра ў рэспубліцы.

Цяпер Міхаіл Аронавіч ужо на пенсіі. Але не парывае ветэран сувязей з роднай альма-матэр, з'яўляецца галоўным сакратаром агульнаўніверсітэцкай спартакіяды.

— Калі 36 год назад я прыехаў сюды, —успамінае ён,—то ўбачыў страшны малюнак разбурэння. Усе карпусы былі спалены, стаялі толькі голыя каробкі.

Першыя секцыі, якія адкрыліся, былі лыжная, лёгкаатлетычная, гімнастыкі. У іх сталі займацца былыя франтавікі. Вельмі цяжка было, але не адчайваліся. Дасталі аднойчы на вакзале трафейныя нямецкія лыжы, прыстасавалі да заняткаў таксама трафейныя турнікі. Шмат гадзін аддавалі прыкладным відам: штыкавому бою, кіданню гранаты ў цэль.

Для заняткаў арэндавалі школы, адрамантавалі адзіную ў той час спортзалу, якую перарабілі з аўдыторыі. Займаліся ў секцыях былыя франтавікі — цяпер прафесар Р. Булацкі, дацэнты У. Пуптан, Р. Міхайлоўскі, Г. Дабравольскі і іншыя.

Р. В. Булацкі цудоўна іграў на акардэоне, быў душой загарадных спартыўных свят. Прайшло некалькі год і спартсмены універсітэта дабіліся значных поспехаў. Першым майстрам спорту па лёгкай атлетыцы стаў цяпер вядомы кінарэжысёр І. Дабралюбаў, тады студэнт журфака. Чэмпіёнам БССР стаў лёгкаатлет А. Крышчановіч, а дацэнт М. Сідарэнка наогул стаў першым у рэспубліцы пасляваенным майстрам спорту па лёгкай атлетыцы.

У той час студэнт юрфака, а сёння старшыня Мінскага гарспорткамітэта Я. Анкуда пачаў развіваць у нас баскетбол. Камандам БДУ не было ў той час роўных у рэспубліцы. Актыўнымі фізкультурнікамі былі ў той час сённяшні прарэктар па вучэбнай рабоце У. Р. Іваш ын, майстар спорту прарэктар А. С. Фядэнка, старшыня Беларускага спорткамітэта В. П. Сазановіч, рэдактар газеты «Фізкультурнік Беларусі» Э. С. Сушкевіч, спартыўныя журналісты З. П. Рыўкін, муж і жонка Пракаповічы і многія іншыя.

У той час шэфствавалі мы над Дзяржынскім раёнам, выступалі па вёсках з паказальнымі практыкаваннямі, дапамагалі ў падрыхтоўцы і судзействе раённых спаборніцтваў. Кожны год арганізоўвалі зорныя паходы.

У пачатку 50-х гадоў прыйшлі працаваць выкладчыкі фізвыхавання У. С. Хрэнаў, М. К. Каваленка, В. П. Шапялевіч, С. І. Кудзінава і іншыя. Яны і цяпер тут працуюць.

Старшыня спаратыўнага клуба універсітэта Віктар Паўлавіч Шапялевіч 31 год ва універсітэце на любімай рабоце. Ветэран працягвае размову:

— З цягам часу ў нас умацавалася спартыўная база, расшырыліся штаты, прыйшлі першыя перамогі, высокія дасягненні. У 1951 годзе пачалі праводзіць лёгкаатлетычную эстафету, праз два гады — агульнаўніверсітэцкую спартакіяду з запрашэннем каманд іншых ВНУ. А ў 1957 годзе яна перарасла ў агульнагарадскую і прысвячаецца дню нараджэння У. І. Леніна. На XVII Алімпійскіх гульнях у Рыме студэнт хімфака Уладзімір Гараеў заваяваў сярэбраны алімпійскі медаль. Чэмпіёнам СССР у трайным скачку стаў Ігар Тарасюк. У 1970 годзе сіламі студэнтаў на месцы балотнай поймы быў пабудаваны стадыён з гумавабітумным пакрыццём.

Традыцыі працягваюцца

— Так усталёўваліся,—працягвае размову старшыня спортклуба, — нашы спартыўныя традыцыі.

Сёння шырока вядомы ў спартыўным

НАСУСТРАЧ 60-ГОДДЗЮ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

НАДЗЕЙНЫ СЯБАР

свеце імёны кандыдатаў у алімпійскую зборную СССР скакуноў у вышыню Т. Бойкі і Л. Клемянцёнак, чэмпіёнкі Еўропы па водных лыжах І. Потэс, чэмпіёнкі VII летняй спартакіяды народаў СССР, студэнткі хімфака Н. Шаўчэнкі (мастацкая гімнастыка) і сярэбранага прызёра спартакіяды старшага выкладчыка У. Фралова (парусны спорт).

Сёння добрых паказчыкаў на рэспубліканскіх спаборніцтвах сярод ВНУ дабіваюцца нашы баскетбалісткі — чэмпіёнкі БССР мінулага года (трэнер В. Е. Шхіньян), футбалісты (трэнер В. Д. Ліштван), валейбалісткі (трэнер В. М. Кучынскі), цяжкаатлеты (трэнер В. Ф. Кавалёў), гімнасткі (трэнер В. В. Седба), лыжнікі (трэнер Л. А. Капылова), лёгкаатлеты (трэнеры М. А. Шаўнерка і В. В. Зарэцкая). Добрай традыцыяй сталі матчавыя сустрэчы з камандамі Прыбалтыкі і Ленінграда па фехтаванню, валейболу, плаванню. БДУ быў ініцыятарам матчавай сустрэчы каманд дзесяці універсітэтаў краіны па мастацкай гімнастыцы, якая ўключана ва ўсесаюзны каляндар. Задаюць тон ва універсітэцкіх спаборніцтвах спартсмены фізфака, ФПМ, мехмата, гістфака.

Праблемы, перспектывы

На жаль, у апошнія гады універсітэт пачаў здаваць свае перадавыя пазіцыі ў вялікім спорце. Так, па выніках выступленняў на VII летняй Спартакіядзе народаў СССР БДУ імя У. І. Леніна аказаўся на 15 месцы сярод ВНУ рэспублікі. Гэта надзвычай нізкі паказчык.

Галоўным тормазам стала беднасць сучаснай спартыўнай базы. Нядаўна прынята рашэнне аб расшырэнні спартыўнай базы. Запланавана ўжо ў сёлетнім годзе пачаць будаўніцтва спартыўнага комплексу з плавальным басейнам, некалькімі спартыўнымі заламі. У перспектыве—будаўніцтва лёгкаатлетычнага манежа.

...Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна развіваецца, будуецца, расце. За сваю амаль 60-гадовую гісторыю, дзякуючы ўвазе і клопатам партыі і ўрада, БДУ дасягнуў выдатных поспехаў, перажывае сёння сваю другую маладосць. Без сумнення, спартсмены універсітэта зноў выйдуць на перадавыя пазіцыі ў рэспубліцы.

У. ШЫК,
студэнт факультэта журналістыкі.



«ЛИСТАЯ КНИГ СТРАНИЦЫ»

составил В. Мартыненко

ПО ГОРИЗОНТАЛИ: 6. Эрцгерцог, с убийства которого начинается знаменитый роман Я. Гашека. 8. Греческий прорицатель, персонаж поэмы Гомера «Илиада». 9. Латышский поэт и драматург XIX — начала XX века. 11. Египетская царица, героиня одной из пьес Бернарда Шоу. 12. Действующее лицо трагедии «Адельгиз», принадлежащей перу классика итальянской литературы Алессандро Мандзони. 14. Трагедия Пьера Корнеля. 16. Сборник ранних стихов Михаила Луконина. 20. Название реки в известной эпопее М. Шолохова. 21. Специалист в области одного из разделов литературоведения. 22. Римский поэт I в. до н. э.

ПО ВЕРТИКАЛИ: 1. Американский поэт XIX века. 2. Фельетон М. Зощенко 1940 года. 3. Роман известного белорусского писателя Ивана Шамякина. 4. Стихотворение 1915 года Эдуарда Багрицкого. 5. Стихотворение Мусы Джалиля (1943 г.), из «Моабитской тетради». 6. Один из отрицательных персонажей романа братьев Вайнеров «Эра милосердия». 7. Повесть Анны Караваевой. 8. Основоположник белорусской советской литературы. 10. Имя главного героя романа английского писателя Джеймса Джойса «Улисс» (1922 г.) 13. Известная польская писательница XIX века. 15. Классик английской литературы. 16. Поэма Н. Тихонова (1920 г.), посвященная Мариэтте Шагинян. 17. Один из «Рассказов о Дзержинском» Ю. Германа. 18. Старший сигнальщик броненосца «Наварин» из романа А. С. Новикова-Прибоя «Цусима». 19. Роман Этель Лилиан Войнич. 20. Автор «Американской трагедии».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 15160 Заказ 722.

30 красавіка 1980 г.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ